Рэктару Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі,
кандыдату мастацтвазнаўства, дацэнту
Куракінай А.В.

**Паважаная Алена Віктараўна!**

Ад імя калектыву Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, творчай інтэлігенцыі нашай краіны прыміце шчырыя віншаванні з 90-годдзем Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі з'яўляецца вядучай вышэйшай навучальнай установай у галіне музычнага мастацтва ў Беларусі, яркім прыкладам арганічнага спалучэння культурных традыцый і наватарства, мастацтва і навукі, узорам каштоўнасных прыярытэтаў у сферы адукацыі.

За мінулыя дзесяцігоддзі творчай працы акадэміяй былі сфарміраваны педагагічныя, творчыя і навуковыя школы, апрабаваны новыя формы і метады працы, дасягнуты выдатныя поспехі і набыты вялікі аўтарытэт і прызнанне ў культурнай міжнароднай прасторы.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь выказвае шчырую падзяку Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі за шматгадовую дружбу і супрацоўніцтва, за дапамогу ў арганізацыі і правядзенні шматлікіх музычных канцэртаў і сустрэч, удзел музыказнаўцаў акадэміі ў мерапрыемствах музея і яго філіялаў.

У гэты дзень прыміце шчырыя пажаданні далейшых поспехаў у вырашэнні актуальных задач у галіне адукацыі і падрыхтоўкі прафесіяналаў сваёй справы, новых здзяйсненняў і адкрыццяў.

З павагай,

Генеральны дырэктар
Нацыянальнага мастацкага музея
Рэспублікі Беларусь,
старшыня Беларускай канфедэрацыі
творчых саюзаў

«Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў»
Рэспубліка Беларусь, грамадскіх аб'яднанняў, Асацыяцыя, г. Мінск

У.І. Пракапцоў

9 снежня 2022 года

г. Мінск